*Моніч Дзмітрый*

# ЖЫЦЦЁ ПАСЛЯ СМЕРЦІ: ЛЁС СПІСАНЫХ МУЗЕЙНЫХ ПРАДМЕТАЎ

У 2021 годзе спаўняецца сто год з дня заснавання Віленскага беларускага музея імя Івана Луцкевіча (далей – музей Луцкевіча) – інстытуцыі, якая стала цэнтрам збірання, захавання і вывучэння беларускай культуры на заходніх тэрыторыях. Юбілей стаў нагодай для складання спіса музейных прадметаў з калекцыі музея Луцкевіча, а дакладней – той часткі, што зараз знаходзіцца ў беларускіх дзяржаўных і прыватных зборах. Праца пераважна ў музейных фондах, непасрэдна з самімі музейнымі прадметамі і ўліковай дакументацыяй, а таксама з архіўнымі дакументамі выявіла супярэчнасці ў афармленні актаў паступлення і спісання.

Віленскі беларускі музей імя Івана Луцкевіча функцыяніраваў у 1921–1945 гг., яго фактычная дзейнасць была спынена ў сувязі з пачаткам баявых дзеянняў Другой сусветнай, а пасля і Вялікай Айчыннай вайны. У пасляваенны перыяд адбыўся падзел музейнай калекцыі паміж Беларуссю і Літвой і толькі невялікая частка збору трапіла ў Беларусь і паступіла ў фонды Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (далей – БДМГВАВ) [1, с. 208]. Доўгі час музейныя прадметы знаходзіліся ў скрынях і не былі заінвентарызаваны, толькі пасля праверкі Міністэрства дзяржаўнага кантролю БССР у 1952 г. іх пачалі запісваць ва ўліковую дакументацыю [2, с. 14]. Асноўная частка музейных прадметаў перадавалася пазней арганізацыйнай групе па падрыхтоўцы гісторыка-краязнаўчага музея БССР (у дакументах сустракаецца таксама як Дзяржмузей, зараз – Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, далей – НГМ РБ) і Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР (зараз Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, далей – НММ РБ), здараліся выпадкі, калі пазней паміж музеямі адбываўся абмен. Невялікая частка музейных прадметаў (пераважна нумізматыка) засталася ў калекцыі БДМГВАВ. Такім чынам, для складання спіса музейных прадметаў з калекцыі музея Луцкевіча трэба было працаваць з уліковай дакументацыяй трох мінскіх музеяў, а для вызначэння апошняга іх месцазнаходжання яшчэ і параўноўваць акты паступленняў на пастаяннае захоўванне і перадачы на пастаяннае захоўванне або нават спісання.

Музейныя прадметы з калекцыі музея Луцкевіча прыбылі ў Беларусь з вопісам, аднак яго месцазнаходжанне сёння невядома [3, с. 14]. У БДМГВАВ акты паступлення на пастаяннае захоўванне не складаліся – адразу запісвалі ў кнігі паступлення з пазнакамі з “Беларускага музея ў Вільні” або “ВИМ” (Виленский исторический музей), часам дадаваўся інвентарны нумар музея Луцкевіча. Адсутнасць вопісу музейных прадметаў з іх дакладным пералікам і апісаннем, а таксама актаў паступлення робяць працэс верыфікацыі паходжання больш складаным, у большасці выпадкаў застаецца толькі давяраць надпісам у графе кнігі паступлення аб паходжанні з музея Луцкевіча.

Безумоўна, прыналежнасць музейнага прадмета да калекцыі музея Луцкевіча найперш вызначаецца ўласнай музейнай дакументацыяй і маркіроўкамі. На сённяшні дзень вядома аб існаванні адной інвентарнай кнігі музея Луцкевіча, што зараз захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ, фонд 518, вопіс 1, справа 1128). Пры яе вывучэнні становіцца зразумелым, што існавала, прынамсі, яшчэ адна інвентарная кніга, на жаль, яе (іх) месцазнаходжанне невядома.

На некаторых музейных прадметах, пераважна разьбяной скульптуры, захавалася маркіроўка “Беларускі музэй”, або “Б.М.” і інвентарны нумар; на графічных творах і часткова на жывапісе, а таксама на прадметах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва – маркі з інвентарным нумарам. Наяўнасць маркіроўкі, безумоўна, дапамагае вызначыць не толькі прыналежнасць да музея Луцкевіча, але і суаднесці музейны прадмет з запісам у інвентарнай кнізе.

Такім чынам, праца па пошуку і ідэнтыфікацыі музейных прадметаў з калекцыі музея Луцкевіча вялася па некалькіх накірунках:

- музейная ўліковая дакументацыя (кнігі паступленняў – інвентарныя, акты);
- маркіроўка на музейных прадметах;
- здымкі экспазіцыі музея Луцкевіча.

Падчас працы з уліковай дакументацыяй НММ РБ, НГМ РБ і БДМГВАВ выявіліся не проста несупадзенні, а нават супярэчнасці і неадпаведнасць рэчаіснасці і дакументаў.

Пры візуальным аглядзе музейных прадметаў з калекцыі “Старажытнабеларуская скульптура” з фонду НММ РБ на некаторых (КП-14657 (мал. 1), ДБС-173; КП-14658 (мал. 2), ДБС-178; КП-14662,

ДБС-194; КП-14666, ДБС-177; КП-14667, ДБС-229) была выяўлена маркіроўка і інвентарныя нумары музея Луцкевіча, а таксама інвентарныя нумары БДМГВАВ (шыфр МИВОВ) або Дзяржаўнага гістарычнага музея, зараз – НГМ РБ (шыфр ГИМ). Зыходзячы з маркіроўкі, можна меркаваць, што дадзеныя музейныя прадметы паходзяць з калекцыі музея Луцкевіча, пазней патрапілі ў БДМГВАВ (шыфр "ГИМ" ставіўся на музейныя прадметы, што знаходзіліся ў калекцыі БДМГВАВ і прызначаліся для перадачы НГМ РБ), а адтуль у калекцыю НММ РБ. Аднак акт паступлення на пастаяннае захоўванне ў НММ РБ вышэйпазначаных музейных прадметаў ад 15.07.1974 № 81 змяшчае зусім іншую інфармацыю аб іх паходжанні: "...пазначаныя ніжэй экспанаты былі вывезены раней даваеннымі экспедыцыямі музея, мелі пашкоджанні жучком-тачыльшчыкам і прыняцце іх у фонды пагражала небяспецы для ўсёй калекцыі. У дадзены момант пазначаныя рэчы прыведзены рэстаўратарамі ў парадак і могуць быць прынятыя ў асноўны фонд".

Супастаўленне інвентарных нумароў БДМГВАВ на згаданых вышэй музейных прадметах з запісамі ў кнігах паступлення пацвердзіла, што яны сапраўды былі ў калекцыі музея, але пазней былі перададзены арганізацыйнай групе па арганізацыі НГМ РБ. Гэтая акалічнасць выглядала цалкам натуральна, бо падобныя прэцэдэнты аб перадачы музейных прадметаў з аднаго музейнага збору ў другі сустракаліся і раней. Таму вымалёўвалася наступная гісторыя бытавання музейных прадметаў: музей Луцкевіча – БДМГВАВ – НГМ РБ, усё пацвярджалася дакументальна. Заставалася верагоднасць, што з НГМ РБ яны былі перададзены НММ РБ, але па нейкай прычыне не была аформлена адпаведная дакументацыя або была аформлена памылкова. Праца з уліковай дакументацыяй НГМ РБ выявіла прычыну несупадзення інфармацыі аб паходжанні музейных прадметаў у актах розных музеяў.

Азначаныя музейныя прадметы патрапілі ў калекцыю НГМ РБ па актах ад 02.04.1957 № 559 і ад 20.01.1960 № 322, але нават не атрымалі інвентарныя нумары і былі спісаны з дазволу Міністэрства культуры БССР як музейныя прадметы, што не маюць музейнага значэння і гісторыка-культурнай каштоўнасці. Найверагодней, рашэнне Міністэрства культуры было прынята на падставе акта ад 13.02.1960, які склалі супрацоўнікі Дзяржаўнага мастацкага музея БССР – загадчык аддзела прыкладнога мастацтва І. М. Паньшына і загадчык аддзела старажытнабеларускага і рускага

мастацтва П. М. Герасімовіч у прысутнасці галоўнага захавальніка фондаў гісторыка-краязнаўчага музея Г. І. Чарновай і галоўнага захавальніка фондаў Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны С. І. Дворкінай: "...у фондах гісторыка-краязнаўчага музея прагледжаны музейныя прадметы з дрэва (спіс прадметаў дадаецца).



*Мал. 1.* Невядомы майстар. Укрыжаванне.
Канец XVII – пачатак XVIII ст.
Дрэва, разьба, тэмпера. КП-14657. НММ РБ



*Мал. 2.* Невядомы майстар. Уваскрэслы Хрыстос. Пачатак XVIII ст.
Дрэва, разьба, паліхромія. КП-14658. НММ РБ

У выніку праведзенай экспертызы ўстаноўлена, што гэтыя прадметы не прадстаўляюць музейнага значэння і гісторыка-культурнай каштоўнасці: яны з'яўляюцца прадметамі грубай рамесніцкай працы, дрэннай захаванасці (пашкоджаны жучком-тачыльшчыкам) і нізкай якасці. Зыходзячы з гэтага лічым, што далейшае іх захаванне ў музеі немэтазгоднае. Дадзеныя прадметы

атрыманы па актах з Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, якому яны ў сваю чаргу былі дасланы Віленскім гістарычным музеем у 1945 г.”.

Трэба адзначыць, што ў спісе, які дадаецца да дадзенага акта, пералічана трыццаць пазіцый, пераважна сакральная скульптура (на сённяшні дзень выяўлена месцазнаходжанне толькі пяці). Вынікае, што астатнія музейныя прадметы з гэтага спіса таксама не знішчаны і зараз могуць захоўвацца ў музейных зборах або прыватных калекцыях. Іх пошук і выяўленне – далейшая праца даследчыкаў.

Адзнака мастацкай вартасці, што дадзена згаданым скульптурам у акце, вельмі спрэчная, а аднясенне іх да ліку тых, што не ўяўляюць музейнага значэння ўвогуле, не вытрымлівае крытыкі. Канешне, гэтыя разьбяныя скульптуры не з’яўляюцца ўзорам мастацкага прафесіяналізму, але неаспрэчна маюць музейнае значэнне – нават толькі за гісторыю свайго бытавання, а таксама ўяўляюць гісторыка-культурную каштоўнасць як зараз, так і шэсцьдзясят год таму.

Такім чынам, вышэйзгаданыя музейныя прадметы паходзяць з калекцыі музея Луцкевіча, у 1945 г. былі прывезены ў Беларусь і знаходзіліся ў БДМГВАВ, пазней былі перададзены на пастаяннае захоўванне ў НГМ РБ, дзе былі спісаны з пазначэннем прычын, што, як пазначалася раней, не адпавядаюць рэчаіснасці. А праз 14 год яны былі аформлены на пастаяннае захоўванне ў НММ РБ з канстатацыяй ілжывай крыніцы паступлення і гісторыі паходжання. Афармленне згаданых музейных прадметаў, як тых, што паступілі ў выніку экспедыцый, тым больш даваенных, не можа быць блытанінай, бо тыя ж самыя супрацоўнікі, што ставілі свае подпісы пад актам спісання, падпісаліся і пад актам паступлення на пастаяннае захоўванне. А пазначэнне праўдзівай крыніцы паступлення музейных прадметаў (з калекцыі музея Луцкевіча) у інвентарных кнігах НММ РБ з’яўляецца пацвярджэннем таго, што гісторыя іх бытавання і спісання была вядома.

Спісанне музейных прадметаў з калекцыі музея Луцкевіча адбывалася і ў БДМГВАВ, пераважна гэта былі абразы і сакральная скульптура, падстава – дрэнны стан захаванасці. Трэба адзначыць, што музейныя прадметы з калекцыі музея Луцкевіча, якія зараз захоўваюцца ў беларускіх музеях, маюць неблагі стан захаванасці і, найверагодней, рэстаўрыраваліся супрацоўнікамі музея Луцкевіча, што ставіць пад сумненне афіцыйную прычыну спісання.

У кнізе паступленняў, што вялася супрацоўнікамі БДМГВАВ для будучага гістарычнага музея пад нумарам 266, знаходзіцца наступны запіс: *аўтар Сергіевіч. Карціна “Богатыри”, 1932 год. Палатно, алей, 1,5х2 м*. Паходжанне пазначана як з Віленскага музея. У графе “заўвагі” – пазнака аб перадачы дзяржмузею 07.06.1967, акт 616.

Асаблівая ўвага на згаданы запіс у кнізе паступленняў была звернута толькі пасля таго, як было паведамлена, што ў рэстаўрацыйных майстэрнях НММ РБ знаходзіцца твор Пятра Сергіевіча, які, найверагодней, паходзіць з калекцыі музея Луцкевіча, а зараз з’яўляецца прыватнай уласнасцю (мал. 3). Пасля азнаямлення з палатном стала відавочна сугучнасць згаданага запісу і самога твора, бо на карціне сапраўды былі выяўлены асілкі, адпавядаў таксама памер 1,5х2 м і год стварэння, які быў пазначаны ў правым ніжнім куце разам з подпісам – П. Сергіевіч – 1932 г., аднак на адваротным баку палатна не былі заўважаны музейныя шыфр ці нумар, таму патрабавалася знайсці яшчэ доказы. Апошнія пытанні адносна прыналежнасці дадзенага твора да калекцыі музея Луцкевіча былі зняты пасля знаходжання яго на вядомым здымку, які рэпрэзентуе экспазіцыю музея ў віленскіх базіліянскіх мурах: справа на другім плане бачна вялікая карціна з вершнікам на кані – дакладнае супадзенне здымка і твора (мал. 4). Не выклікае сумнення, што карціна на здымку ў экспазіцыі музея Луцкевіча, запіс у кнізе паступленняў БДМГВАВ і карціна з прыватнай калекцыі – гэта адзін твор мастака Пятра Сергіевіча. Пытанне толькі ў тым, як карціна з музейнага збору патрапіла ў прыватную калекцыю.

У 1945 годзе палатно, як і іншыя прадметы з калекцыі музея Луцкевіча, было прывезена ў Беларусь і перададзена ў калекцыю БДМГВАВ. У кнізе паступленняў музея ў графе заўваг стаіць знак паўтора, які адсылае да запісу вышэй – пазнака аб перадачы дзяржмузею (зараз – НГМ РБ) у 1967 г. Для ўдакладнення далейшага лёсу музейнага прадмета быў вывучаны акт перадачы на пастаяннае захоўванне, але сярод пераліку музейных прадметаў, што перадаюцца дзяржмузею, няма карціны Сергіевіча. Спасылка на акт спісання памылковая, а значыць карціна надалей застаецца музейным прадметам у калекцыі БДМГВАВ. Як і чаму музейны прадмет знік з музейнага збору – адкрытае пытанне.



*Мал. 3.* Сергіевіч П. Асілкі. 1932. Палатно, алей. 1500х2000 см. Прыватны збор

Трэба адзначыць, што застаецца верагоднасць сапраўднага спісання згаданага твора Пятра Сергіевіча з калекцыі БДМГВАВ, але па іншым акце і распараджэнні Міністэрства культуры БССР, якія аднак своечасова не пазначылі ў графе заўвагі, і з цягам часу яны патанулі сярод іншай уліковай дакументацыі музея.

На прыкладзе згаданых музейных прадметаў разглядаецца агульная сітуацыя ў музейнай справе Беларусі, а мэта артыкула – узняць праблему, што закранае абсалютна ўсе музеі, каб пачаць яе абмяркоўваць у прафесійным асяроддзі. Замоўчванне праблем і памылак у сферы захавання і ўліку і далейшая іх перадача "ў спадчыну" наступным пакаленням музейных супрацоўнікаў вядзе не толькі да парушэнняў заканадаўства ў музейнай галіне, але і спрыяе памылковым высновам падчас вывучэння музейных прадметаў.



*Мал. 4.* Экспазіцыя Віленскага беларускага музея імя Івана Луцкевіча

*Спіс выкарыстанай літаратуры*

1. Доклад художника и консерватора Виленского Белорусского музея Пётра Сергиевича директору Белорусского государственного музея истории Великой Отечественной войны / П. Сергіевіч // Вяртанне: дакументы і архіўныя матэрыялы па праблемах пошуку і вяртання нац. каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь / Беларус. фонд культуры. – Мінск, 1992. – 256 с.

2. Скалабан, В. Лёс вернутых у Мінск каштоўнасцей / В. Скалабан // Голас Радзімы. – 17 чэрвеня 2004 г. – № 22–25. – С. 14.

3. Скалабан, В. Лёс каштоўнасцей Віленскага беларускага музея / В. Скалабан // Голас Радзімы. – 19 жніўня 2004 г. – № 30–33. – С. 14.